# Візыт журналістаў зь Беларусі

25—26 красавіка ў Беластоку пабывала група журналістаў некалькіх беларускіх газэтаў, часопісаў, радыёвяшчаньня і тэлебачаньня. Усе яны займаюцца эканамічнай публіцыстыкай. Іхную пабыўку арганізавала Ўсходняе гаспадарчае таварыства зь сядзібай у Беластоку, пры дапамозе Фонду разьвіцьця Беластоцкага ваяводзтва і Польска–брытанскай праграмы разьвіцьця прадпрымальніцтва.

Праграма візыту была вельмі насычаная. Беларускія журналісты наведалі некалькі беластоцкіх прадпрыемстваў і сустрэліся зь беластоцкімі журналістамі ў "*Gazecie Wyborczej*". Адбылася таксама прэс–канфэрэнцыя з удзелам генэральных консулаў — РБ у Беластоку і РП у Горадні. Завяршэньнем праграмы была сустрэча ў будынку БГКТ з тутэйшымі беларускімі дзеячамі.

Пра тое, як працуюць польскія прадпрыемствы, госьці зь Беларусі пісаць будуць у сябе. Са свайго боку я хачу падзяліцца ўражаньнямі ад апошняй сустрэчы.

Пасьля доўгага выступленьня старшыні БГКТ Яна Сычэўскага пачалася дыскусія. Госьці зь Беларусі цікавіліся жыцьцём тутэйшых беларусаў, якіх некаторыя зь іх называлі "дыяспарай", значыць — эміграцыяй. Адна з журналістак спыталася нават, ці тутэйшыя беларусы гэта эмігранты ў другім ці трэцім пакаленьні. Усё–такі было гэта выключэньне, якое выклікала ўсьмешкі яе калегаў.

Іншыя пацікавіліся, чаму ў зале няма гістарычнай беларускай сымболікі, гэта значыць Пагоні. Старшыня БГКТ тлумачыў, што раней была, але дыпляматы зь Беларусі параілі яе зьняць. Цяпер яна вісіць у ягоным кабінэце. Спадар Сычэўскі паясьняў далей, што мы тут мусім быць вельмі ляяльнымі да ўраду Беларусі, бо мы — прадстаўнікі іншай дзяржавы і ня хочам правакацыі. Паводле яго, Пагоня мае ўсё ж такі дзяржаўны характар.

Дыскусію, якая пачала разгортвацца, прытушыў доўгім і палітычным выступленьнем Мікола Гайдук. Закрануў ён гістарыясафічную праблему Ўсходу і Захаду, да якога цягнецца Польшча. Усхваляў бязь меры прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь. Сьцьвердзіў, між іншага, што калі польская прэса насьмейваецца з Лукашэнкі, дык толькі таму, каб празь ягоную асобу насьмейвацца зь беларускага народу. Паводле спадара Гайдука, шчыры беларус ніколі не напіша кепска пра прэзыдэнта Лукашэнку. Дрэнна пра яго пішуць толькі тыя беларусы, якія мусяць, бо бяруць за гэта грошы.

Паколькі Мікола Гайдук павучаў гасьцей як нейкіх школьнікаў, яны сталі разьвітвацца з гаспадарамі.

Прэса ў Беларусі даўно ўжо атрымала загад усхваляць прэзыдэнта Лукашэнку. Які ж тады сэнс мае закліканьне тамтэйшых журналістаў, каб яны рабілі гэта ад душы, замест таго, каб знаёміць іх з нашымі тут праблемамі?

*Друкуецца паводле:*
Ніва. 1996. 19 мая. № 20. С. 4.